**Выбары*2025. Аналітычная справаздача аб утварэнні тэрытарыяльных выбарчых камісій**

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*2025*[1] *арганізаваная Беларускім Хельсінкскім камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі паводле адкрытых крыніцаў і паведамленняў ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВЫ

Агульныя ўмовы і рэальная працэдура фармавання тэрытарыяльных выбарчых камісій (ТВК), што з'яўляюцца важным механізмам выбарчага працэсу, дэманструюць дзяржаўны дырыжызм усіх выбарчых працэсаў пры імітацыі актыўнага ўдзелу грамадзянскай супольнасці, што дае поўны кантроль дзеючай выканаўчай уладзе над сфармаванымі камісіямі.

- Фармаванне тэрытарыяльных выбарчых камісій адбываецца ва ўмовах, калі сярод двух ключавых актараў грамадзянскай супольнасці — палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў — не засталося арганізацый, якія маглі б праявіць незалежную ініцыятыву. Успадкаваныя з савецкіх часоў "працоўныя калектывы" не з'яўляюцца палітычнымі суб'ектамі і выбарчыя працэсы ад іх імя арганізуюцца адміністрацыйнымі метадамі. Грамадзяне,[2] таксама надзеленыя правам удзелу ў фармаванні тэрытарыяльных выбарчых камісій, запалоханыя агульнай атмасферай тэрору; а супраць тых, што былі актыўныя ў мінулыя выбарчыя цыклы, ужываюцца прэвентыўныя рэпрэсіі.
- Магчымасці грамадскага кантролю, незалежнага назірання за працэсам фармавання тэрытарыяльных выбарчых камісій не проста зведзеныя да нуля, але з'яўляюцца дзейнасцю, якая пераследуецца.
- На карысць адміністрацыйна-каманднага кіравання ўсім працэсам сведчыць і агульная спешка: 1,725 чалавек нібыта былі вылучаныя партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі, працоўнымі калектывамі і грамадзянамі ўсяго за 1 тыдзень у колькасці, неабходнай для фармавання фактычна ўсіх камісій у максімальным складзе.
- Пры гэтым інфармаванне грамадзян аб магчымасці вылучэння, як і ў папярэдняй кампаніі 2024 г., было мінімальным, што дазваляе прыйсці да высновы аб незацікаўленасці ўладаў у актыўным удзеле выбаршчыкаў у фармаванні тэрытарыяльных выбарчых камісій і перадвызначанасць рашэнняў аб іх складзе.

[1] "Выбары*" ў дачыненні да выбарчай кампаніі-2025 выкарыстоўваецца кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі цалкам рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае

[2] "Грамадзянін" ды іншыя назоўнікі марфалагічнага мужчынскага роду выкарыстоўваюцца ў значэнні агульнага роду і абазначаюць усе гендары.

- Публічна даступная толькі мінімальная інфармацыя як аб магчымасцях вылучэння ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, так і аб пасяджэннях органаў, якія ўтвараюць камісіі, а таксама іх выніках: працэс правядзення пасяджэнняў заставаўся непразрыстым і неканкурэнтным. Спісы чальцоў камісій з прозвішчамі па-ранейшаму не публікуюцца.
- Ключавым рэсурсам выканаўцаў, што забяспечваюць правядзенне выбараў* на ўзроўні тэрытарыяльных выбарчых камісій (акрамя пакінутых пасля перарэгістрацыі чатырох палітычных партый, што ўсе падтрымліваюць курс дзеючай улады), застаюцца чатыры найбуйнейшыя грамадскія аб'яднанні (БРСМ, "Белая Русь", Саюз жанчын, Саюз ветэранаў, Фонд міру), якія маюць з 2023 г. заканадаўча замацаваны асаблівы статус набліжанасці да дзяржавы, і прафсаюзы, якія ўваходзяць у ФПБ. Працэнт "праходнасці" кандыдатаў ад гэтых праўладных партый і грамадскіх аб'яднанняў, якія імітуюць грамадзянскую супольнасць ды сумесна фармуюць 63% складаў усіх камісій, імкнецца да 100%.
- Такім чынам, улічваючы атмасферу агульнай запалоханасці, адсутнасць эфектыўнага інфармавання ды вельмі сціснутыя тэрміны, можна канстатаваць, што ў актыўных грамадзян фактычна адсутнічала магчымасць вылучыць сваіх прадстаўнікоў у склад ТВК. Мэта этапу фармавання ТВК была хутчэй супрацьлеглая: правесці яго як мага хутчэй і цішэй.

## I. ПРАВАВАЯ БАЗА

Непасрэдныя працэсы арганізацыі выбарчага працэсу ўскладаюцца на камісіі. Тэрытарыяльныя камісіі правяраюць дакладнасць подпісаў, сабраных у падтрымку вылучэння кандыдатаў у прэзідэнты, ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю і дапамогу ўчастковым выбарчым камісіям, якія ў сваю чаргу працуюць са спісамі выбаршчыкаў, арганізоўваюць галасаванне ды ўстанаўліваюць яго вынікі на ўчастку. Выбарчы кодэкс (ВК) вызначае парадак утварэння камісій, а таксама іх склад.

**Сістэма камісій.** Падрыхтоўку і правядзенне выбараў прэзідэнта забяспечваюць пастаянна дзеючая Цэнтральная выбарчая камісія (ЦВК),[3] а таксама тэрытарыяльныя камісіі (ТВК) і ўчастковыя выбарчыя камісіі (УВК), якія фармуюцца для правядзення выбараў прэзідэнта.[4] Асобныя пытанні фармавання ТВК і УВК урэгуляваныя пастановай ЦВК ад 24 кастрычніка 2024 г. № 69 "Аб тлумачэнні парадку ўтварэння камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь".

**Утварэнне камісій.** Абласныя ТВК і Мінскую гарадскую камісію ўтвараюць прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласныя, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт у складзе 9-13 чальцоў камісіі.[5] Раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання без раённага дзялення) і раённыя камісіі ў гарадах утвараюць адпаведныя раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты і Саветы дэпутатаў. Прынятыя ў 2023 г. змены ў Выбарчы кодэкс скарацілі максімальную колькасць чальцоў раённых і гарадскіх выбарчых камісій з 13 да 11 чалавек.

**Тэрмін утварэння выбарчых камісій.** Улічваючы, што выбары прызначаныя на 26 студзеня 2024 г., ТВК мусілі быць утвораныя не пазней за 6 лістапада 2024 г.[6]

---

[3] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 26
[4] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 27
[5] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 34
[6] Гл. арт. 34 Выбарчага кодэкса: ТВК мусяць быць утвораныя не пазней чым за 80 дзён да выбараў.

**Фармаванне складу камісій.** Камісіі па выбарах фармуюцца з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама з прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы.

У склад камісій не могуць уваходзіць: суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Старшынямі камісіі не могуць быць: блізкі сваяк кандыдата ў Прэзідэнты, муж (жонка) кандыдата ў Прэзідэнты, асоба, якая знаходзіцца ў непасрэдным падначаленні ў кандыдата ў Прэзідэнты.

Прадстаўнікоў у склад абласных камісій маюць права вылучаць:

1. Кіруючы орган адпаведнай абласной арганізацыйнай структуры палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання;

2. Сход працоўнага калектыву арганізацыі або калектыву структурнага падраздзялення, якія налічваюць не менш за 10 супрацоўнікаў і размешчаных на тэрыторыі адпаведнай вобласці;

3. Група грамадзян, што валодаюць выбарчым правам (далей – група выбаршчыкаў), у колькасці не менш за 10 чалавек – у абласную камісію вобласці, на тэрыторыі якой яны пражываюць (зарэгістраваныя па месцы жыхарства або месцы знаходжання).

Прадстаўнікоў у склад Мінскай гарадской камісіі маюць права вылучаць:

1. Кіруючы орган Мінскай гарадской арганізацыйнай структуры палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання;

2. Сход працоўнага калектыву арганізацыі або калектыву структурнага падраздзялення, якія налічваюць не менш за 10 супрацоўнікаў і размешчаных на тэрыторыі г. Мінска;

3. Група выбаршчыкаў у колькасці не менш за 10 чалавек, што пражываюць на тэрыторыі г. Мінска (зарэгістраваных па месцы жыхарства або месцы знаходжання).

Прадстаўнікоў у склад раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённых у гарадах камісій мае права вылучаць:

1. Кіруючы орган раённай, гарадской (у горадзе абласнога падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённай у горадзе арганізацыйнай структуры палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання – у раённую, гарадскую (у горадзе абласнога падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённую ў горадзе камісію, на тэрыторыі якой размешчана адпаведная арганізацыйная структура;

2. Сход працоўнага калектыву арганізацыі ці калектыву структурнага падраздзялення, што налічваюць не менш за 10 супрацоўнікаў, – у адпаведную раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію раёна, горада, раёна ў горадзе, на тэрыторыі якога размешчана арганізацыя або структурнае падраздзяленне;

3. Група выбаршчыкаў у колькасці не менш за 10 чалавек – у раённую, гарадскую (у горадзе абласнога падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённую ў горадзе камісію раёна, горада, раёна ў горадзе, на тэрыторыі якога яны пражываюць (зарэгістраваныя па месцы жыхарства або месцы знаходжання).

Сумесныя рашэнні прэзідыума адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта прымаюцца большасцю галасоў ад складу. У сумесным пасяджэнні гэтых органаў мусяць удзельнічаць не менш як дзве траціны складу прэзідыума мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта.

Утвараюць камісіі прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх Саветаў дэпутатаў і адпаведныя выканаўчыя камітэты, а таксама раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты, адміністрацыі раёнаў у гарадах. На пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.

У рашэнні аб утварэнні камісій указваюцца прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) кожнага чальца камісіі, спосаб вылучэння ў склад камісіі, месца знаходжання і нумары тэлефонаў камісіі.

У сувязі з унясеннем змяненняў у ВК, рашэнні аб фармаванні камісій у друкаваных сродках масавай інфармацыі не публікуюцца. Замест гэтага публікуецца толькі паведамленне аб утварэнні камісій не пазней чым праз 7 дзён пасля фармавання камісій. **Пайменны склад чальцоў камісіі перастаў быць даступным**, інфармацыя ёсць толькі пра факт фармавання і агульным ліку чальцоў камісіі. Паведамленне аб утварэнні гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковых, сельскіх камісій у той жа тэрмін можа быць даведзена да ведама грамадзян іншым спосабам, які не канкрэтызуецца заканадаўча.

Рашэнне органаў, якія ўтварылі камісію, можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд суб'ектамі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі. Скарга павінна быць падпісаная адпаведна кіраўніком палітычнай партыі (арганізацыйнай структуры), іншага грамадскага аб'яднання (арганізацыйнай структуры), кіраўніком іншай арганізацыі (структурнага падраздзялення), грамадзянамі, якія вылучылі прадстаўніка ў склад камісіі шляхам падачы заявы. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

## II. ВЫЛУЧЭННЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ У СКЛАД ТВК

В У адпаведнасці з каляндарным планам, вылучэнне прадстаўнікоў у склад ТВК было запланавана правесці да 31 кастрычніка 2024 г. Улічваючы прызначэнне выбараў 23 кастрычніка, на вылучэнне прадстаўнікоў было адведзена вельмі мала часу: усяго адзін тыдзень.[7] Тым не менш улады ўклаліся ў сціснутыя тэрміны, і ўжо 2 лістапада ЦВК апублікаваў статыстыку па вылучаных кандыдатах на сяброўства ў ТВК.[8]

Афіцыйныя звесткі аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных камісій паказваюць,[9] што ў склад 153 ТВК *(6 абласных і Мінская гарадская, 118 раённых, 4 гарадскіх у гарадах абласнога падпарадкавання, 24 раённыя ў гарадах)* вылучана 1725 чалавек *(на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах было вылучана 2171 чалавек)*, з іх 755 чалавек былі вылучаны, згодна з інфармацыяй ЦВК, грамадзянамі шляхам збору подпісаў.[10] Зніжэнне колькасці кандыдатаў у сябры ТВК на 20% і поўная адсутнасць незалежных кандыдатаў тлумачыцца рэпрэсіўным уціскам грамадскай актыўнасці, устанаўленнем жорсткага кантролю за працэсам вылучэння ў сябры камісій і паўсюднай атмасферай страху ў выніку рэпрэсій супраць нелаяльных.[11] Супраць актывістаў, якія ўдзельнічалі ў мінулых выбарчых кампаніях ужываюць прэвентыўныя рэпрэсіі, астатнія грамадзяне чытаюць у навінах пра затрыманні "апазіцыянераў" і вучэннях міліцыі па баявым зладжванні і адпрацоўцы вызвалення

[7] Улады не ўпершыню вызначаюць сціснутыя тэрміны для вылучэння кандыдатаў у чальцы камісій — на прэзідэнцкіх выбарах у 2020 г. ад пастановы аб прызначэнні выбараў 8 траўня да тэрміну падачы 17 траўня вызначана 9 дзён; у 2015 г. адпаведна 30 чэрвеня і 19 ліпеня (19 дзён), у 2010 г. — 14 і 26 верасня (12 дзён), але ў гэтай кампаніі такі тэрмін самы кароткі.
[8] Тэлеграм-канал ЦВК Беларусі: https://t.me/cikbelarus/2843
[9] ЦВК, Звесткі аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных камісій: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/stat1-2.pdf
[10] Праваабаронцы за свабодныя выбары, Аналітычная справаздача аб назіранні за фармаваннем тэрытарыяльных выбарчых камісій, 2020: https://elections2020.spring96.org/be/news/97093
[11] Праваабаронцы за свабодныя выбары, сітуацыя перад выбарамі*2025: https://elections2025.spring96.org

закладнікаў.[12] Гэта ўсё аказвае стрымліваючы ўплыў на рашэнне людзей удзельнічаць у выбарчых камісіях.

Этап вылучэння ў чальцы выбарчых камісій фактычна ператварыўся ў этап складання амаль вынікавага пераліку правераных на лаяльнасць падчас папярэдніх выбарчых кампаній. Пераважная большасць прадстаўнікоў – 68,35% – вылучана праўладнымі грамадскімі аб'яднаннямі, з якіх 15,88% – пакінутымі пасля перарэгістрацыі 4 праўладнымі палітычнымі партыямі;[13] 16,35% – прафсаюзамі, што ўваходзяць у праўладную Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі (ФПБ). 25,68% прадстаўнікоў былі нібыта вылучаныя грамадзянамі шляхам падачы заяў. Паколькі ўсе незалежныя палітычныя партыі былі прымусова ліквідаваныя,[14] яны не мелі доступу да вылучэння сваіх прадстаўнікоў у камісіі.

## Кандыдаты на сяброўства ў ТВК




Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, ЦВК абмежаваўся вызначэннем толькі фармальных патрабаванняў да размяшчэння інфармацыі на сайтах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Яны ўключаюць толькі час і месца прыёму дакументаў аб вылучэнні прадстаўнікоў.[15] У сваю чаргу, А. Лукашэнка публічна паставіў задачу перад мясцовымі органамі ўлады не расслабляцца і рыхтавацца да горшага сцэнару, дзе, відавочна, пад "горшым сцэнаром" маецца на ўвазе грамадзянская актыўнасць, якая праявіла сябе на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах.[16]

[12] Кубраков: МВД с ноября начнет активно готовиться к выборам: https://sputnik.by/20241025/kubrakov-mvd-s-noyabrya-nachnet-aktivno-gotovitsya-k-vyboram-1090594105.html
[13] Характэрна, што раней роля партыяў у працэсе вылучэння кандыдатаў адзначалася яшчэ больш нізкім узроўнем удзелу. 8,2% прэтэндэнтаў ад партыяў вылучаліся ў 2020 г.: https://elections2020.spring96.org/be/news/97866; 7,1% – у 2010 г.: https://spring96.org/be/news/39905, прычым тады мелі магчымасць вылучаць сваіх кандыдатаў і 3-4 апазіцыйныя партыі.
[14] Вясна, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Верасень 2023 https://spring96.org/be/news/112957
[15] Пастанова ЦВК ад 24 кастрычніка 2024 г. № 69 “Аб тлумачэнні парадку ўтварэння камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь”: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post69-2025.pdf
[16] Брестский областной исполнительный комитет, Как должны пройти президентские выборы в Беларуси и кому нельзя расслабляться. Подробности совещания у Лукашенко, 06.11.2024

Ва ўмовах выхалашчанага грамадска-палітычнага поля адзіным спосабам забяспечыць некаторую ступень грамадскага кантролю за працай ТВК заставалася вылучэнне асобных грамадзян з дапамогай збору подпісаў. Эфектыўнае і масавае выкарыстанне гэтай магчымасці павінна забяспечвацца дастатковым інфармаваннем грамадзян па папулярных каналах інфармацыі, уключна з падрыхтоўкай адпаведных кіраўніцтваў і памятак, а таксама наяўнасцю дастатковага часу для збору подпісаў. У выніку ж інфармаванне аб гэтым этапе было мінімальным, зведзеным да вызначаных ЦВК фармальнасцяў.[17] Акрамя таго, як было адзначана вышэй, у патэнцыйных вылучэнцаў заставаўся толькі тыдзень, з 24 кастрычніка па 31 кастрычніка — і ўсяго два выходныя дні — для збору подпісаў і прадастаўлення дакументаў для вылучэння. І таму ёсць усе падставы меркаваць, што фармальнае вылучэнне чальцоў камісій "ад грамадзян" таксама насіла адміністрацыйна-арганізаваны характар.

Такім чынам, улічваючы атмасферу агульнай запалоханасці, адсутнасць эфектыўнага інфармавання ды вельмі сціснутыя тэрміны, можна зрабіць выснову, што ў актыўных грамадзян фактычна адсутнічала магчымасць вылучыць сваіх прадстаўнікоў у склад ТВК. Мэта этапу вылучэння кандыдатаў у чальцы ТВК была хутчэй супрацьлеглая: правесці гэты этап як мага хутчэй і цішэй.

## III. ПАСЯДЖЭННІ ОРГАНАЎ ПА ФАРМАВАННІ КАМІСІЙ

У адрозненне ад кампаніі 2020 года, ЦВК закрыла магчымасці для назірання за ходам утварэння камісій: шырокай грамадскасці недаступныя ні анлайн-трансляцыі, ні наступныя поўныя відэазапісы пасяджэння, ні запрашэнні на пасяджэнні без анлайн трансляцыі і запісу.[18] Пастанова ЦВК № 69 таксама не прадугледжвае магчымасць прысутнасці на пасяджэннях прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, назіральнікі ад якіх акрэдытаваныя ў ЦВК.[19] Фармальна магчымасць прысутнасці захаваная толькі для прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў і грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.[20]

Інфармаванне аб правядзенні пасяджэнняў органаў, якія фармуюць камісіі, таксама было цалкам фармальным: некалькі радкоў пра дату і час правядзення пасяджэння, часцяком — без тлумачэння мэты яго правядзення ды інфармавання грамадзян, што яны маюць права прысутнічаць на пасяджэнні ў выпадку вылучэння сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.[21] Акрамя таго, нават згаданыя мінімальныя нататкі на сайтах выканкамаў і адміністрацый мусілі з'явіцца "не пазней, чым за два дні да правядзення пасяджэння"[22] — некаторыя органы

https://www.brest-region.gov.by/ru/news-ru/view/kak-dolzhny-projti-prezidentskie-vybory-v-belarusi-i-komu-nelzja-rasslabljatsja-podrobnosti-2000017589-2024

[17] Адзінымі крыніцамі канкрэтнай інфармацыі застаюцца сайты мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, прычым адпаведныя даныя знаходзяцца не ў стужцы навін, але за банерам "Выбары", які можа не ўспрымацца як самастойная ўкладка, у якой знаходзіцца рэлевантная інфармацыя: гл. прыклады тут: https://grodno-region.gov.by/ru, https://minsk.gov.by/ru/

[18] Гл. рэгуляванне выбараў 2020 г.: пастанова ЦВК ад 8 траўня 2020 г. № 13 (у рэд. пастановы Цэнтральнай камісіі ад 15.05.2020 № 24), п. 8: https://rec.gov.by/files/2020/post13.pdf

[19] Пастанова ЦВК ад 24 кастрычніка 2024 г. № 69 "Аб тлумачэнні парадку ўтварэння камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь": https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post69-2025.pdf

[20] Тамсама, п. 8

[21] Сярод іншых, гл. інфармацыю на сайце Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта (https://vitebsk.gov.by/ru/obrazovaniekom/view/4-nojabrja-2024-goda-v-1400-po-adresu-g-vitebsk-ul-lenina-32-zal-zasedanij-5-etazh-sostoitsja-sovmestnoe-34619/), Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта (https://grodno-region.gov.by/ru/ter_komissii-ru)

[22] Дадатак 2 да пастановы Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь 24.10.2024 № 75: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post75-2025.pdf

ігнаравалі[23] і гэтую норму, што ў чарговы раз дазваляе канстатаваць непразрыстасць працэдур, адсутнасць галоснасці і арыентаванасці на грамадзян, што не дазваляе ім эфектыўна рэалізаваць правы на ўдзел у працэсе фармавання ТВК.

Адсутнасць хоць якога грамадскага кантролю і непразрыстасць працэсу прыняцця рашэнняў на падобных пасяджэннях не дазваляюць казаць, што грамадзянам, палітычным партыям ды іншым грамадскім аб'яднанням была нададзеная эфектыўная магчымасць узяць удзел у фармаванні камісій на канкурэнтнай аснове. Аб фармальнасці гэтага працэсу сведчаць і прадстаўленыя ЦВК суадносіны кандыдатаў у чальцы ТВК і "адабраных" прадстаўнікоў: мяркуючы па даных ЦВК, як мінімум у Мінскую гарадскую і 4 гарадскія ТВК (у гарадах абласнога падпарадкавання) у адсутнасць якога-небудзь конкурсу прайшлі ўсе кандыдаты, конкурс у астатнія камісіі быў мінімальным.[24]

## IV. СКЛАД УТВОРАНЫХ ТВК

Паводле даных ЦВК,[25] у склад 153 ТВК увайшлі 1689 чальцоў або 97,9% ад вылучаных кандыдатаў. Пры наяўнасці ў органаў, якія фармуюць камісіі, магчымасці вар'іраваць колькасць чальцоў камісій ад 9 да 11 або 13 у залежнасці ад тыпу камісіі, пераважная большасць ТВК (усе абласныя, Мінская гарадская, усе гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) і ўсе раённыя камісіі) сфармаваны ў роўным, максімальна дапушчальным заканадаўствам складзе, што можа служыць чарговым сведчаннем штучнай прыроды працэсу фармавання камісій.




[23] Напрыклад, аб'ява аб пасяджэнні Кастрычніцкай раённай камісіі ў г. Віцебску была апублікаваная за дзень да прызначанай даты пасяджэння: https://vitebsk.gov.by/ru/obrazovaniekom/view/6-nojabrja-2024-goda-sostoitsja-zasedanie-oktjabrskoj-rajonnoj-v-g-vitebske-komissii-po-vyboram-prezidenta-34653/

[24] ЦВК, Звесткі аб складзе тэрытарыяльных камісій: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/stat3-4.pdf

[25] Тамсама

Крыху падрасла,[26] але захоўваецца традыцыйна нізкай для Беларусі доля прадстаўнікоў палітычных партый у складзе камісій – 16,04%, што значна ніжэй долі прадстаўнікоў іншых грамадскіх аб'яднанняў – 52,93%. Гэта сведчанне нязначнай ролі, якую палітычныя партыі граюць у палітычнай сістэме краіны, а таксама, магчыма, паказчык спробы дэпалітызацыі ўладамі ўсіх працэсаў вакол выбараў*2025, нават ва ўмовах фармавання камісій цалкам лаяльнымі прадстаўнікамі.

У параўнанні з папярэдняй выбарчай кампаніяй,[27] гендарная дыспрапорцыя ў складзе камісій трохі зменшылася: доля жанчын складае 67,85%, доля мужчын – 32,15%. Пры гэтым захоўваецца тэндэнцыя зніжэння долі жанчын у адпаведнасці з павышэннем узроўню камісій: на больш нізкіх узроўнях іх прадстаўніцтва значна вышэй, а ў ЦВК – 33,3%.

Імёны і прозвішчы прызначаных чальцоў камісіі не публікуюцца, вакол іх у большасці выпадкаў ствараецца заслона сакрэтнасці. У асобных выпадках, калі ў СМІ з'яўляюцца імёны прызначаных старшыняў камісій або маецца фота складу камісіі, можна вызначыць, што склады ТВК застаюцца практычна нязменнымі ў параўнанні з папярэднімі выбарчымі кампаніямі.

[26] На папярэдніх трох прэзідэнцкіх выбарах прадстаўніцтва ад усіх палітычных партый у ТВК было ніжэй 8%

[27] Праваабаронцы за свабодныя выбары, Выбары*2024. Аналітычная справаздача аб фармаванні тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій, с. 14 https://elections2024.spring96.org/be/news/113679